Источник: **«Звязда» - 2012-11-27**

# Мірскія

## Мірскія — нашчадкі Рурыкавічаў?

Прозвішча Мірскі ў свядомасці жыхароў Беларусі ў першую чаргу асацыюецца з двайным прозвішчам *Святаполк-Мірскі*, якое мелі прадстаўнікі шляхецкага роду герба "Бялыня". Род*Мірскіх* упершыню ўзгадваецца ў пісьмовых крыніцах XVI стагоддзя. У пачатковы перыяд ніхто з *Мірскіх* не тытулаваўся князямі. Больш за тое, у дакументах таго часу *Мірскія* адзначаюцца як небуйныя землеўладальнікі на тэрыторыі Браслаўскага павета, выхадцы са служылых людзей. Пазней, у XVIII стагоддзі, прадстаўнікі роду Мірскіх пачалі залічваць сябе да княжацкага роду. Яны сцвярджалі, што маюць тое ж самае паходжанне, што і князі Вялікага Княства Літоўскага — Святаполк-Чацвярцінскія. Як і Чацвярцінскія, Мірскія да свайго прозвішча дабавілі прыдомак Святаполк, каб падкрэсліць, што паходзяць ад Святаполка Ізяславіча, вялікага князя кіеўскага, або Святаполка Акаяннага. Аднак многія сучаснікі Мірскіх, а таксама даследчыкі літоўска-рускіх князёў не прызнавалі княжацкага паходжання Мірскіх і называлі іх псеўдакнязямі. І ўсё ж прадстаўнік роду Мірскіх Тамаш-Багуміл-Ян Мірскі, абапіраючыся на сямейныя традыцыі, дамогся ў 1821 годзе ад Сената Польскага Каралеўства прызнання княжацкай годнасці. А пазней (у 1861 годзе) і ў Расійскай імперыі Мірскім было дазволена называцца князямі: род Святаполк-Мірскіх быў зацверджаны ў старажытнай дваранскай годнасці і ўнесены ў шостую частку (як старажытны нетытулаваны дваранскі род) і ў пятую частку (як княжацкі род) радаслоўных кніг Віленскай, Мінскай і Харкаўскай губерняў.

## Славутыя прадстаўнікі роду

***Рыгор Мірскі*** (год нараджэння невядомы, памёр у 1661 годзе), праславіўся як вайсковы дзеяч. Ён прымаў удзел у вайне Рэчы Паспалітай са Швецыяй (1600 — 1629 гг.) і Расіяй (1609 — 1618). Штурмаваў занятыя казакамі Рэчыцу, Пінск, камандаваў калонай пры аблозе Бабруйска, удзельнічаў у Лоеўскай бітве. Рыгор Мірскі прыняў удзел у падпісанні вядомага Кейданскага дагавора (1655) аб устанаўленні уніі Вялікага Княства Літоўскага са Швецыяй.

***Тамаш Мірскі*** (1738 — 1793) — генерал-ад'ютант польнай булавы ВКЛ, маршалак Браслаўскага павета. Прымаў удзел у абранні караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага.

***Станіслаў Войцех Мірскі*** (1756 — 1805) — вялікі пісар Вялікага Княства Літоўскага, пасол на сеймы 1784, 1788. Адзіным з арганізатараў паўстання 1794 года пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі супраць расійскай акупацыі і прускай інтэрвенцыі.

***Дзмітрый Іванавіч Мірскі*** (1824 — 1899) — генерал-ад'ютант, член Дзяржаўнага савета, камандзір палка падчас Крымскай вайны, кутаіскі генерал-губернатар.

***Мікалай Іванавіч Мірскі*** (1833 — 1898) — генерал-ад'ютант, генерал ад кавалерыі, член Дзяржаўнага савета, у руска-турэцкую вайну камандаваў дывізіяй, наказны атаман Войска Данскога. Менавіта Мікалай Святаполк-Мірскі набыў у 1891 годзе Мірскі замак разам з навакольнымі маёнткамі. Дзякуючы яго намаганням у Міры быў пабудаваны вінакурны завод, двухпавярховы палац, закладзены парк.

Ігар Капылоў. Мірскія

***Пётр Дзмітрыевіч Мірскі*** (1857 — 1914) — міністр унутраных спраў Расіі.

***Міхаіл Мікалаевіч Мірскі*** (1870 — 1938) — дыпламат, служыў паверaным Расійскай імперыі у Пекіне, Мюнхене, Стамбуле, Балгарыі. Вылучаўся сваёй эрудыцыяй, ведаў шмат заходнееўрапейскіх і ўсходніх моў. У 1921 годзе мястэчка Мір адышло да Польшчы, і ў гэтым жа годзе Міхаіл Мірскі перабраўся ў Мір і ўзяўся за рэстаўрацыю замка. Нават прэзідэнт Польшчы Ігнацій Масціцкі, які наведаў Мір у 1929 годзе, высока ацаніў работу Міхаіла.

**Паходжанне прозвішча**

Гісторыкі сведчаць, што ў 1891 годзе князь Мікалай Святаполк-Мірскі набыў у княгіні Марыі Львоўны Гагенлоэ-Шылінгфюрст маёнтак у Мінскай губерні, які меў мясцовую назву Замір'е з руінамі замка XVI стагоддзя. Адным з матываў набыцця Святаполк-Мірскімі гэтай спадчыны Радзівілаў было перакананне, што прозвішча іх паходзіць ад назвы мястэчка і імкненне "абвысакародзіць" тытул", скарыстаўшы супадзенне назвы мястэчка і прыдомка да прозвішча князя як спадчынную "радавую" фамільную прыналежнасць. Аднак да Мірскага замка продкі Святаполк-Мірскага ніякага дачынення не мелі, хоць і прылічваліся да дваран Мінскай губерні. Прозвішча *Мірскі* па сваім паходжанні звязана з назвай сучаснага раённага цэнтра ў паўночна-заходняй частцы Віцебскай вобласці — Мёры. Паводле адной з версій, этымалогія назвы населенага пункта Мёры звязана са старажытным словам "мір" у значэнні абшчына. Існуе таксама думка, што паходжанне назвы *Мёры*, або *Меры*, звязана з фіна-ўгорскім племем *мера, мер,* што мае пад сабой падставы, паколькі фіна-угры сапраўды пакінулі глыбокі след у тапаніміі гэтай тэрыторыі. На карысць гіпотэзы, што прозвішча Мірскі паходзіць ад назвы населенага пункта *Мёры,* служыць той факт, што ўпершыню землеўладальнікі Мірскія ў пісьмовых крыніцах упамінаюцца менавіта ў дачыненні да гэтай тэрыторыі.




Прозвішчы

● Мірскі

Імя Святаполк даволі часта сустракаецца ў беларускіх летапісах: *Святаполк Ізяславіч, Святаполк Мсціславіч, Святаполк Уладзіміравіч.* Двухасноўныя імёны мелі спадчынны характар і сацыяльную афарбоўку: у славянскіх краінах яны замацоўваліся за княжацкімі дынастыямі і прадстаўнікамі вышэйшых слаёў грамадства. Літаральна імя Святаполк у далёкім мінулым магло быць растлумачана як *"кіраўнік свяшчэннага войска"*.

**Сучасныя Мірскія**

Двайное прозвішча *Святаполк-Мірскі* цяпер на тэрыторыі Беларусі не адзначаецца. На Гродзеншчыне (Ваўкавыскі, Зэльвенскі і Смаргонскі раёны) і Брэстчыне (Баранавіцкі раён) сустракаецца прозвішча Мірскі, але носьбіты гэтага прозвішча ніякага дачынення да славутага роду не маюць. У гэтым выпадку прозвішча *Мірскі* ўказвае на тое, што яго носьбіты з'яўляюцца выхадцамі з пасёлка Мір Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці.

**Ігар Капылоў**